Источник: "Наша слова" - 2014-03-12

# Цікавае мерапрыемства

4 сакавіка 2014 года ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі ў рамках праекта "Апякункі паэтычных нябёсаў" адбылася вечарына ***"Галоўнае ў жыцці - жыццё"***, прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння вядомай беларускай паэтэсы Еўдакіі Лось. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Цэнтральная навукоая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Уладзімір Караткевіч назваў некалі Еўдакію Лось "жытніцай" - "істотай з беларускага фальклёру, якая жыве ў каласах і памірае толькі тады, калі апошні чалавек сабраў свой ураджай".

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі падрыхтавала выставу "Зараз выкажу, выпею сонца - душу", прысвечаную творчай спадчыне Еўдакіі Лось. На выставе будзе магчымасць убачыць усе яе прыжыццёвыя зборнікі (ад "Сакавіка" (1959) да "Лірыкі ліпеня" (1977), а таксама апошнія перавыданні і сучасныя публікацыі яе твораў.

Адной з арганізатараў мерапрыемства з'яўляецца вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

На мерапрыемстве выступалі: пісьменнік Уладзімір Ліпскі, а таксама сын паэтэсы Зміцер Лось. З цікавасцю грамадскасць паслухала выступленне ўзорнага ансамбля народнай музыкі "Бараўлянская крынічка". Было цікава.

***Аляксей Шалахоўскі,***
*гісторык, журналіст.*

Аляксей Шалахоўскі. Цікавае мерапрыемства